3. Личный архив автора. Интервью № 002 с Н. А. Тимофейчик. — Брестская обл., Березовский р-н, д. Войтешин, 2015 г., нояб.

4. Личный архив автора. Интервью № 003 с О. А. Кожух. — Брестская обл., Березовский р-н, д. Пески, 2015 г., нояб.

5. *Лоскутова*, *М. В.* Хрестоматия по устной истории / М. В. Лоскутова ; пер., сост., введение, общ. ред. М. В. Лоскутовой. — СПб. : Изд-во Европ. ун-та в С.-Петербурге, 2003. — 396 с.

6. *Ожегов*, *С. И.* Толковый словарь русского языка / С. И. Ожегов, Н. Ю. Шведова. — М. : А ТЕМП, 2008. — 944 с.

7. *Строев*, *К. Ф.* Краеведение [Электронный ресурс] / К. Ф. Строев. — Режим доступа : http://school-kraevedenie.narod.ru/stroev/stroev1.htm. — Дата доступа : 01.12.2015.

8. *Хальбвакс*, *М.* Социальные рамки памяти / М. Хальбвакс. — М. : Новое издательство, 2007. — 348 с.

Андрэй Стрҷнчанка

вядучы метадыст ДУ «Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці», магістрант кафедры ўсеагульнай гісторыі і сусветнай культуры УА «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава» (г. Віцебск, Беларусь)



# Сядзіба «Мілае» дзяржаўнага і грамадскага дзеяча Віцебшчыны XIX ст. Ігната Манькоўскага: гісторыя і сучаснасць

У басейне Заходняй Дзвіны,
Дзе Лужаснянка цячэ,
Курганы, бы карані,
Мая вёска спрадвеку жыве.
Тут прастора палёў і лясоў,
Хараство незямное навокал…
Мазалава… Тут радзіма мая
І жывая крынічка вытокаў!

*А. Струнчанка*

У аграгарадку Мазалава Віцебскага раёна Віцебскай вобласці захавалася сядзіба «Мілае» (помнік архітэктуры XIX ст.) колішняга дзяржаўнага і грамадскага дзеяча Віцебшчыны Ігната Антонавіча Манькоўскага, які нарадзіўся на Віцебшчыне ў 1765 г. у сям'і дробнага шляхціца. Вядома, што пасля навучання ў езуіцкім калегіуме Ігнат Манькоўскі ў 1783 г. паступіў на дзяржаўную службу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Здольнасці дазволілі Манькоўскаму зрабіць добрую кар'еру. Ён становіцца калежскім асэсарам, служыць старшынёй дэпартамента ў Магілёўскім губернскім магістраце. Ігнат Антонавіч займаў і пасады віцебскага губернскага пракурора, і віцэ-губернатара Віцебскай губерні, пра што сведчаць «Нататкі» Дабрыніна 1812—1815 гг., апублікаваныя ў гістарычным часопісе «Русская старина» (1871 г., т. IV): «…По случаю смерти вице-губернатора г-на Сушки, заступилъ губернскій прокуроръ Маньковскій. Я не долженъ пропустить въ молчаніи того, что онъ въ сіе, хотя краткое, но еще смутное и отчетистое время, показалъ себя неусыпнымъ и взыскательнымъ, съ благоразуміемъ…».

У «Русской старине» (1882) у раздзеле «Императоръ Павелъ и его время» таксама можна прачытаць легендарную гісторыю, што адбылася з Манькоўскім у 1797 г. Яна стала вядомая на ўсю Расійскую імперыю і звязана з вялікім каханнем 30-гадовага Ігната да прыгажуні дачкі колішняга камергера апошняга караля Рэчы Паспалітай стацкага саветніка Антона Макавецкага (меў землі ў Магілёўскай губерні), якую звалі Рахель.



Трэба заўважыць, што ўжо тады існавала цесная сувязь з магілёўскімі землямі. Нездарма работнікі культуры аг. Мазалаўскі сёння працягваюць супрацоўнічаць з магіляўчанамі ў межах праекта «Сцяжынкамі мазалаўскіх святынь: ад Віцебска да Магілёва». Асноўным мерапрыемствам праекта стала сустрэча прыдзвінскіх і мсціслаўскіх мазалаўчан у час правядзення раённага свята гульняў і ігрышчаў «Мазалаўскі карагод гульняў–2014», што праводзілася ў рамках святкавання Года гасціннасці і было прысвечана 425-годдзю першай згадкі пра мястэчка Мазалава.

Канстанцін Манькоўскі, пляменнік Ігната Антонавіча, у сваёй нататцы прыводзіць першы рэскрыпт ад «февраля 17-го 1797 года» — «письмо государя къ Маковецкому», дзе Павел I адзначыў: «…Съ моей же стороны, для поспешества оному, пожаловалъ я жениху чинъ, место и деревню…». Зразумела, пасля гэтага ў хуткім часе згулялі вяселле. Праз некаторы час выйшаў другі рэскрыпт, у якім Манькоўскаму надаваўся чын надворнага саветніка, і ўказ аб дарэнні яму ў Віцебскай губерні Буеўскага маёнтка («въ 12-ти верстахъ отъ Витебска»), побач з якім размяшчалася вёска Мазалава. Канстанцін Манькоўскі піша, што гэтую зямлю «…купилъ у Талькэ (прозвішча мясцовага шляхціца. — *А.С.*) мой дядя; на приданое, полученное за женою, построилъ каменный двухъ этажный домъ. Далъ этой новой усадьбе названіе "Милой"…». І нездарма ягоны пляменнік у сваіх мемуарах піша: «Широкія пакоі яго

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дома мэбляваны былі вельмі проста, — і толькі на сцяне ў гасцінай, над сафою, займаў ганаровае месца ў пазалочанай раме партрэт імператара Паўла І».

Манькоўскі вызначыўся яшчэ і ў час вайны 1812 г. Пра вынікі знаходжання напалеонаўскіх войскаў у Віцебску ён расказаў у лісце ў рэдакцыю пецярбургскага часопіса «Сын Отечества», дзе асуджаў агрэсію і, наогул, усе захопніцкія войны.

Ігнат Антонавіч знаходзіў час для таго, каб весці гаспадарку ў сваім «Мілым», дзе пасля адстаўкі ў 1817 г. канчаткова пасяліўся. Манькоўскі быў блізкі да дзеячаў Асветніцтва, аб чым сведчыць той факт, што ў 1830 г. ён прыняў удзел у конкурсе, абвешчаным пецярбургскім Вольным эканамічным таварыствам, за што ў 1831 г. яго адзначылі залатым медалём і 30 чырвонцамі. У сваім сачыненні славуты Ігнат Антонавіч падсумаваў уласны досвед сельскага гаспадара і глыбокага знаўцы народнага жыцця, а таксама патрабаваў паляпшэння побытавых умоў для сялян, выказаў каштоўныя думкі па пытаннях сельскага будаўніцтва, жывёлагадоўлі, ветэрынарыі, санітарыі, аховы прыроды. Ён клапаціўся аб дабрабыце сваіх прыгонных, рамантуючы ім хаты ды перарабляючы іх з «чорных» (дымных) у «белыя» — з печамі і камінамі. Актуальная і сёння думка Манькоўскага аб неабходнасці берагчы лес, шукаць у Беларусі крыніцы паліва, карысныя выкапні, напрыклад каменны вугаль. Гэта ці не першыя ў Беларусі зафіксаваныя на паперы геалагічныя і экалагічныя ідэі. Цікава тое, што ў працы змешчана шмат цікавых этнаграфічных назіранняў. Так, Манькоўскі дае апісанне вясельнага абраду на Віцебшчыне. Праца выйшла ў 1833 г., пасля смерці Ігната Антонавіча, у «Трудах Вольного экономического общества».

Дзякуючы патрыётам-краязнаўцам — Дзмітрыю Газіну, Мікалаю Піваварў, Дзянісу Юрчаку, Людміле Нікіцінай, Ірыне Выхадцавай і інш. — імя Манькоўскага жыве і сёння. Некалькі гадоў запар выходзіў зборнік гістарычных нарысаў Людмілы Рублеўскай «Рыцары і дамы Беларусі», дзе быў змешчаны нарыс «Як цар Ігната ажаніў», у якім апавядаецца гісторыя нашага героя. У дзень святкавання 90-годдзя Віцебскага раёна ў аграгарадку Ноўка была адкрыта алея знакамітых людзей, дзе сёння ёсць помнік і Ігнату Манькоўскаму. Традыцыйным з 2011 г. стала правядзенне раённага свята гульняў ды ігрышчаў «Мазалаўскі карагод гульняў» на тэрыторыі помніка архітэктуры — сядзібы «Мілае», якое было арганізавана ў межах праекта «Мазалаўская старонка: краязнаўчыя і этнаграфічныя таямніцы» (складаўся



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

з наступных этапаў: «Сем цудаў вёскі Мазалава і яе ваколіц», «Сем знакамітых асоб “Мілага”», «Вяселле па-беларуску, або Мазалаўскае вяселле»). Сёння ж на тэрыторыі помніка архітэктуры размяшчаецца царква Святога пакутніка Іаана Воіна.

З мэтай даследавання гісторыка-культурнай спадчыны і яе папулярызацыі ў межах мерапрыемстваў «Фэсту экскурсаводаў–2015» работнікамі культуры аг. Мазалаўскі быў распрацаваны экскурсійны маршрут «Гісторыя Мазалава і ваколіц: ад маёнтка да аграгарадка», рухаючыся па якім госці і жыхары вёскі наведалі «візітоўку» Мазалава — помнік архітэктуры. Пасля правядзення мерапрыемства аграгарадок наведалі турысты з Польшчы, Расійскай Федэрацыі, а таксама ўдзельнікі праекта «Дыялог народаў і культур» (замежныя студэнты віцебскіх УВА), рэалізацыя якога пачалася ў бягучым годзе на базе Мазалаўскага сельскага Дома культуры.

Такім чынам, даследаванні ў галіне краязнаўства падкрэсліваюць, што гісторыя і культура народа — найважнейшая частка нашай спадчыны, якая спрыяе фарміраванню нацыянальнай свядомасці будучых пакаленняў і дазваляе ўбачыць малюнкі жыцця нашых продкаў, паказаць вытокі сучаснасці.



Адносіны грамадзян да культуры свайго народа, роднай мовы, развіцця нацыянальных традыцый — гэта тое, што вызначае сёння маральнасць, патрыятызм, гатоўнасць да жыцця на карысць сваёй Радзімы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ